ДОБРЫ ВЕЧАР
Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1992 КАСТРЫЧНІК 23 Пятніца

№ 202 (387)

Цана 1 рубель

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

● ФАКТ

НАКОНЕЦ-ТО!..

СЕРГЕЙ ЮРЬЕВ, репортер «ДВ».

27 ОКТЯБРЯ в Минске начнет работу Международный симпозиум «Влияние радиации на щитовидную железу».

В течение четырех дней ученые Беларуси, России, Украины, США, Германии, Франции обменяются информацией и опытом, прочтут и обсудят доклады по медико-биологическим аспектам аварии на Чернобыльской АЭС.

Предполагается, что в рамках симпозиума будет работать выставка медицинской техники и лекарств.

Основные доклады подготовлены учеными Научно-исследовательского института радиационной медицины (НИИРМ) Министерства здравоохранения Беларуси, являющегося головным институтом по разделу «Радиационная медицина» и занимающегося изучением распределения радионуклидов в пищевых продуктах, оценкой полученных и прогнозируемых доз облучения населения, разработкой научных основ диспансеризации, методов диагностики и коррекции выявленных нарушений, обусловленных действием радиации и др.

Брифинг для журналистов и всех заинтересованных работой симпозиума состоится 28 октября, в 17 часов, по адресу: пр. Машерова, 19 (конференц-зал).

● ЭХО СЕССИИ

ЧТО ПОКАЗАЛО «ПОИМЕННОЕ ГОЛОСОВАНИЕ» ДЕПУТАТОВ НА НЕОБЫЧНОМ ВЕРНИСАЖЕ

ОЛЕГ ПАВЛОВ, РИД.

НАРОДНЫХ депутатов, спешащих на сессию, встречают не только пикеты и челобитчики, но и... живописные полотна по актуальной политической тематике.

ХУДОЖНИК Сергей Давидович устроил свой вернисаж прямо в фойе Верховного Совета. В промежутках между заседаниями депутаты теперь имеют возможность не только покурить (в буфете продаются «Беломор» и «Астра»), выпить чашку чая (кофе обычно ближе к обеду кончается), но и отдохнуть душой, любуясь пейзажами либо полотнами политическо-исторической направленности. Народный депутат Э. Воговцов даже оставил запись в книге отзывов: «Большое спасибо за красоту». Эта благодарность пока единственная и потому особенно ценна.

● ДЕЛОВОЙ МИНСК

ВКЛАДЫВАЙТЕ ВАЛЮТУ В «ДВИЖИМОСТЬ»...

АНАТОЛИЙ БЕЛОУС, корреспондент «ДВ».

ПОЗАВЧЕРА выглянул в окно и глазам своим не поверил. По проспекту Скорины катил троллейбус, да не простой, а спаренный, так называемая «гармошка». Деталей не рассмотрел, но одно заметил — машина шла порожняком. Такое «явление» для улиц столицы в диковинку и потому обратился в трамвайно-троллейбусное управление.

— Машина, которая Вас заинтересовала, — опытный образец, — рассказывает начальник ТТУ Минска Е. Д. Власко. — До конца года она будет проходить обкатку. Изготовил ее наш завод «Белкоммунмаш» по документации, разработанной на Украине. Сделана она в единственном экземпляре, и сейчас решается вопрос ее стоимости. К слову, установить цену не так-то просто, каждый день дорожают комплектующие и материалы.

Серийное же производство аналогичных троллейбусов налаживается на знаменитом заводе «Южмаш», что в Днепропетровске. Думаю, это дело у бывших ракетостроителей пойдет. Мы уже заключили с ними договор на поставку в Минск до конца года десяти таких машин. Прорабатывается вопрос поставки еще двух десятков на следующий год. Одно обескураживает — цена, каждый из них обойдется нам в 12 миллионов рублей. Но деваться некуда, городской парк электротранспорта изнашивается, ветшает, ему нужна замена.

В ближайшие дни ожидаем и «посылку» из России. Завод Урицкого, что в городе Энгельсе, уже отгрузил нам две новые машины. И тоже «гармошки». Да и стоимость их не шокирует — чуть более четырех миллионов. Потребность в таких троллейбусах в столице давно назрела. Скорее всего, пустим их по тому же проспекту Скорины. Ведь здесь даже не в часы «пик» невозможно проехать по маршруту. Кстати, характеристики и параметры южмашевской продукции весьма обнадеживают. Их сочлененные троллейбусы вмещают до 180 пассажиров, имеют два ведущих моста венгерского производства.

Куда менее оптимистично смотрит Евгений Дмитриевич на обновление трамвайного парка столицы. И хотя город получил пять вагонов чешского производства в прошлом году и уже одиннадцать—в этом, поставки из-за рубежа на этом прекратились. По договору же Минск до конца года должен приобрести еще одиннадцать машин. И в предстоящие десять лет пражане намеревались поставлять нам по 22 единицы ежегодно. Но валюты у города кот наплакал, а каждый вагон стоит 712 тысяч долларов. Между тем, Рижский вагоностроительный завод уже четыре года как перепрофилировал свое производство на выпуск электричек. Правда, просвет в этой ситуации все-таки намечается. Чехов заинтересовало наше сырье, в частности, карбомид.

В любом случае, начальник ТТУ надеется на валютную помощь спонсоров. Ими могут стать любое предприятие или фирма города, которым не безразлично наше будущее, здоровье горожан. Ведь не секрет, что перспективы у электротранспорта куда более предпочтительны. Одно то, что он является экологически чистым, несет огромные выгоды столице. Правда, сегодня нагрузки на него значительно возросли. Редеет парк автобусов, а тех же «Икарусов» за четыре года не закуплено ни одного. Щедрость же спонсоров ТТУ предполагает возместить соответствующей рекламой. А опыта такой пропаганды здесь не занимать.

ІНФАРМБЮРО

КАЛЯНДАР

ВОСЕНЬ. 297 ДЗЕНЬ ГОДА.

СОНЦА ўзышло ў 8.51, зайдзе ў 18.56. Даўжыня дня 10.01.
МЕСЯЦ — маладзік (25 кастрычніка).

ІМЯНІНЫ

СЕННЯ: Андрэя, Севярына, Марлены.
ЗАЎТРА: Піліпа, Зінаіды, Марціна.
У НЯДЗЕЛЮ: Андрона, Марціна, Дар'і, Інгі.

У 7 гадз. Сонца (даўгата 210) уступае ў сузор'е Скарпіёна. Па гараскопу ў «Скарпіёна» сімвал — вада, планета — Марс, талісман — хрушч, колер каменя — жоўты (топаз, жоўты сапфір).

НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

Знікаюць апошнія кучавыя воблакі.
«Марцін святы — губіцель гагаты», Прадавалі птушку, смажылі яе к гэтаму прысвятку.

ЯК ПАВЕДАМІЎ ГІДРАМЕТЦЭНТР

СЕННЯ ў 11 гадзін у Мінску быў 1 градус цяпла. Ціск 721 мм ртутнага слупа. Адносная вільготнасць 90 працэнтаў. Вецер паўднёва-заходні — 3—9 м/сек.

ЗАЎТРА ў Мінску чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, ноччу часам ападкі. Тэмпература паветра ноччу — 1—3 градусы марозу, днём — 1—3 цяпла.

● СОЦОБЕСПЕЧЕНИЕ

НЕ ДОВЕДЕМ ПЕНСИОННЫЙ ФОНД ДО СОСТОЯНИЯ КОМЫ?

СВЕТЛАНА КУЛИКОВА, БелаПАН.

Привычный факт: в установленный день каждого месяца пенсионеры получают определенную денежную сумму. Сегодня вопрос социальной защиты малообеспеченных слоев населения стоит особенно остро. Так, 6 мая этого года в соответствии с Постановлением Совмина республики был увеличен размер минимальной заработной платы. Соответственно возросла сумма пенсий и пособий на детей в малообеспеченных, многодетных семьях.

Безусловно, все это требует дополнительных средств, которые выплачиваются из Пенсионного фонда. Так, например, по Минской области месячные выплаты возросли с 200 миллионов рублей в апреле до 945 миллионов в сентябре. В то же время на 1 августа задолженность Пенсионному фонду в области составила 880 миллионов рублей, причем она постоянно растет. Это делает невозможным своевременную выдачу пенсий и помощи. Как же быть пенсионерам в такой ситуации?

Меры, конечно, принимаются. Есть специальное Постановление Совета Министров республики, которое обязывает руководителей предприятий и организаций, всех плательщиков взносов в Пенсионный фонд срочно ликвидировать задолженности. Здесь хотелось бы обратить внимание на моральную сторону дела. Неужели мы дойдем до того, что покинем на произвол судьбы такую многочисленную и самую беззащитную категорию населения как пенсионеры? Хотелось бы верить, что до этого не дойдет. И те средства, которые отчисляются плательщиками в Пенсионный фонд, будут поступать своевременно и перечисляться в первую очередь.

● ЗАРУБЕЖНАЯ БелаПАНорама

✦ **24 ОКТЯБРЯ** в Махачкале пройдет очередной съезд Партии трудящихся Дагестана, преемницы бывшей республиканской организации Коммунистической партии.

◆ **ПО СООБЩЕНИЮ** Бендерской комендатуры миротворческих сил, в городе постоянно совершаются преступления с применением незаконно хранящегося оружия. Всего за время функционирования комендатуры (с августа этого года) зафиксировано 7 разбоев, 18 грабежей и 12 убийств. В городе стало правилом различные торжественные мероприятия, в частности свадьбы, отмечать «торжественными» взрывами гранат.

◆ **ВЕРХОВНЫЙ СОВЕТ** Азербайджана принял решение о глобальном сокращении в Кабинете министров — как штатов в министерских аппаратах, так и вообще министерских «портфелей».

✦ **В НИЖНЕМ НОВГОРОДЕ** завершился Первый всероссийский съезд Советов рабочих. 158 делегатов из России, Казахстана, Беларуси и Украины избрали Центральный исполнительный комитет, в состав которого вошли два человека от минского Совета рабочих. Сформирован также теневой кабинет министров — из числа таких известных политических деятелей, как Макашов, Анпилов, Стародубцев, Тулеев.

● СИТУАЦИЯ

РАЗОШЛИСЬ, КАК В МОРЕ КОРАБЛИ...

ИРИНА ЛЕВШИНА, БелаПАН.

НА ПРОШЛОМ совещании глав правительств стран Содружества в Бишкеке было решено признать нецелесообразной дальнейшую работу Комиссии по подготовке соглашения о разделе государственных невоенных морских судов. Таким образом, ряд бывших «республик-сестер», в том числе и Беларусь, оказались «у разбитого корыта». Их стремление получить часть судов торгового флота бывшего СССР пока стремлением и остается. Хотя правда как раз на их стороне, поскольку каждая республика в свое время вкладывала средства в развитие морского транспорта Союза.

Руководствуясь этими соображениями, белорусское правительство направило Президенту России письмо за подписью Председателя Совета Министров Вячеслава Кебича. В нем содержится просьба о содействии в вопросе передачи части невоенных морских судов Беларуси.

— Прогнозировать реакцию российского правительства сложно, — сказал в интервью корреспонденту БелаПАНа ведущий специалист управления территориального развития, архитектуры и строительства Совета Министров Беларуси Сергей Бенедис. — Но мы все же надеемся, что она будет положительной, учитывая наши добрые отношения с Россией. В противном случае мы будем прорабатывать другие возможные варианты.

Кстати, Россия в этом вопросе сама оказалась в роли несколько «обиженной»: известно, что основными «судовладельцами» в СНГ как были, так и остаются страны Балтии и Украина.

НА ГРАНИЦЕ «ЗАЙЦЫ» ХОДЯТ ХМУРО...

РИД.

В ВЫСТУПЛЕНИИ на сессии белорусского парламента премьер-министр Вячеслав Кебич заявил о возможности введения продажи дотируемых Беларусью товаров (в основном это продукты питания) только за расчетные билеты Национального банка. Председатель Совмина информировал депутатов и о последних решениях властей Украины, которая не желает иметь с нами «прозрачную» границу, и сказал, что Беларуси придется пойти на ответные меры.

● ПЕРЕКРЕСТОК

РАК, ИНФАРКТ, АВТОМОБИЛЬ...

ЛЕОНИД СИЗЫХ, сотрудник ГАИ УВД Мингорисполкома.

ДА, ИМЕННО в таком порядке, по данным Всемирной организации здравоохранения, находятся главные источники опасности нашей жизни. Ежегодно на автодорогах мира гибнут свыше 250 тысяч и получают увечья более шести миллионов человек.

В обеспечении безопасности заинтересованы все. Но там, где об этом забывают хотя бы на один день, тут же увеличивается количество несчастных случаев. Таким днем для Минска было 18 октября 1992 года.

Дорожная обстановка начала обостряться в 10 часов 30 минут, когда на Партизанском проспекте напротив дома № 80 автомашиной был сбит пешеход, который, находясь в состоянии опьянения, переходил дорогу в неустановленном месте.

11 ЧАСОВ 20 МИНУТ, проспект Скорины — столкновение автомашин (1 человек пострадал).

12 ЧАСОВ. На улице Карастояновой на обозначенном пешеходном переходе совершен наезд на человека. Пострадавший скончался в больнице.

12 ЧАСОВ 25 МИНУТ. Партизанский проспект. Сбит пешеход, который переходил проспект в неустановленном месте.

14 ЧАСОВ. Улица Чижевских. Автомашина врезается в осветительную мачту, погибает пассажир.

14 ЧАСОВ. Улица Богдановича. Наезд на девочку на пешеходном переходе.

18 ЧАСОВ. Ул. Р. Люксембург. Наезд на пешехода. От травм он скончался в больнице.

18 ЧАСОВ 30 МИНУТ. Ул. Калиновского. Пешеход в нетрезвом виде решил перейти улицу в неположенном месте. Сбит автомашиной.

21 раз выезжала оперативная группа в этот день на дорожные аварии. Итог печальный: 3 человека погибли, 6 ранены. Как видите, несмотря на меры, принимаемые Госавтоинспекцией г. Минска, обстановка на городских магистралях остается тревожной.

ПРОСИМ СООБЩИТЬ

10 сентября 1992 года в 20 часов автомашиной марки ГАЗ-24 на 8 км Московского шоссе, около спортивного комплекса СКА, был совершен наезд на пешехода, который от полученных травм скончался при доставке в больницу.

1 октября 1992 года около 19 часов на 3 км Минской кольцевой дороги, в районе Степянки, около подземного перехода, неустановленной автомашиной смертельно травмирован мужчина.

14 октября 1992 года в 19 часов на ул. Л. Карастояновой, около дома № 41, неустановленной автомашиной смертельно травмирован мужчина, который переходил дорогу по пешеходному переходу.

Просьба к свидетелям ДТП сообщить о себе по тел.: 20-73-48, 25-18-43, 25-44-44.

ПРА МОВУ РАЗМОВА

БелаПАН.

24 КАСТРЫЧНІКА Ў КІНАЗАЛЕ ПАЛАЦА КУЛЬТУРЫ МІНСКАГА АЎТАЗАВОДА АДБУДЗЕЦЦА ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ВЫКАНАННЕ «ЗАКОНА АБ МОВАХ» Ў ГОРАДЗЕ МЕНСКУ». АРГАНІЗОЎВАЕ КАНФЕРЭНЦЫЮ МІНСКАЯ РАДА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ.

«ЭЛЬБО—БАУ ГРУПА І ПАРТНЁРЫ»

БелаПАН.

На паўночнай украіне Бярозы нямецкай фірмай «Эльбо-Бау група і партнёры» ўзводзіцца жыллё для ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў з былой Групы савецкіх войск у Германіі. Будаўнікі з Патсдама абавязаліся па кантракту здаць у эксплуатацыю 720 кватэр, дзіцячы сад-яслі на 255 месцаў, гандлёва-бытавы комплекс з аптэкай, універсамам, домам быту, поштай, сталовай.

Сёння новабудоўля набывае рэальныя контуры. Будаўнікі мінскага арэнднага прадпрыемства, якія таксама задзейнічаны на будоўлі, вядуць мантажныя работы, за якасцю якіх даволі прыдзірліва і педантычна сочаць прадстаўнікі нямецкай фірмы.

● БелаПАН-СИНЕМА

НЕ ЖИЗНЬ—ОДНО КИНО

ИРИНА НОЗДРИНА, БелаПАН.

С 4 ПО 12 ноября в Минске пройдет фестиваль кинофильмов известного немецкого режиссера Вернера Херцога. Он будет организован Союзом кинематографистов Беларуси и московским культурным центром имени Гёте.

Творчество Херцога у нас практически неизвестно, в то время как его картины прогремели на всю Германию: фильм «Каждый сам за себя, а Бог против всех» завоевал специальный приз в Каннах. Он рассказывает о судьбе мальчика-найденыша, который, попав в дом профессора Даунера, открывает для себя новый мир. Не менее интересна картина «Фицкарральдо», сюжет которой может заинтриговать даже скептиков: ирландец Бриан Фицкарральдо присваивает себе голос Энрико Каруэо. Он — мечтатель и фантазер — задумывает покорить мир...

В ноябре зритель получит возможность ближе познакомиться с творчеством неординарного мастера искусства, просмотрев и другие его киноленты: «Агирре — гнев божий», «Стеклянное сердце», «Войцек».

● ФУТБОЛ: ЕЎРАКУБКІ

УЧОРА БАГАТЫЯ ЗНОЎ ПЛАКАЛІ

ІВАН КАХНОВІЧ, «ДВ».

Да і пасля поўначы ўчора на тэлеэкране панаваў футбол. Але той, хто адважыўся ахвяраваць дзве гадзіны сну нічога не страціў — відовішча было прыемнае. Маскоўскія дынамаўцы «падцёрлі» нос хвалёным профі з самай багатай лігі. Ніякіх шанцаў не пакінулі яны ў гэтай сустрэчы футбалістам «Тарына».

А адным з герояў матча стаў левы абаронца «Дынама» Сяргей Цімафееў, які ўжо на працягу першых пяці мінут меў дзве магчымасці забіць гол гаспадарам. Так адразу стала ясна, што дынамаўцы не збіраюцца адседжвацца ў акопах, а будуць шукаць шчасця ў атацы. І яно ім усміхнулася на 45-й мінуце.

Пасля перапынку італьянцы прыбавілі. Але, каб не памылка ўсё таго ж Цімафеева на 56-й мінуце. Калі мяч пасля прастрэлу Касагранда папаў яму ў грудзі і ўляцеў у вароты «Дынама», то гаспадары б можа, аднаго гола не забілі. Пасля гэтага пакрыўджаны дынамавец пайшоў «искуплять» віну і на 68-й мінуце менавіта пасля паса Цімафеева Сімуценкаў цудоўным ударам у «дзевятку» прынёс перамогу масквічам — 2:1.

А ў Маскве добра памучылі сваіх прыхільнікаў спартакаўцы. Яны гулялі з яшчэ адным грандам еўрапейскага футбола — «Ліверпулем». Англічане, трэба сказаць, пакінулі вельмі добрае ўражанне. Яны першымі прапусцілі гол пасля ўдара Пісарава, аднак змаглі пераламіць гульню і адраўнялі лік. Прычым дапамаглі «Ліверпулю» ў гэтым самі масквічы, якія «затаўклі» мяч ва ўласныя вароты. Але нездарма кажуць, што «Спартаку» спрыяе нехта «наверсе». У дадзеным выпадку ўвасобілася гэтая «дапамога», мне здаецца, у няўдалай гульні варатара ліверпульцаў. Ён фактычна арганізаваў другі гол, калі няўдала спрабаваў адбіць мяч, а Карпін перахапіў перадачу і дакладна прабіў па пустых ужо варотах. А пасля і наогул «зламаў» гульню сваёй каманды, калі наўмысна спыніў выхад спартакаўца на вароты недазволеным прыёмам. Грабелаар быў выдалены з поля, прызначаны пенальці рэалізаваў Карпін. Праўда, да гэтага моманту лік быў 2:2, пасля памылкі абаронцы гол забіў Макманаман. У вароты «Ліверпуля», пасля доўгіх дэбатаў, стаў абаронца і ў спартакаўцаў з'явіліся надзеі на перамогу з буйным лікам. Аднак пашчасціла толькі Ледзяхаву, які за тры мінуты да канца правёў чацвёрты гол. На большае ў масквічоў проста не хапіла сілаў. Перамога «Спартака» — 4:2.

● ПО МОРЯМ, ПО ВОЛНАМ

ЮРИЙ ЗАХАРОВ, «ДВ».

ДЫХАНИЕ ТЕПЛЫХ ВЕТРОВ, НЕПОВТОРИМЫЕ МОРСКИЕ ПЕЙЗАЖИ ПРИВЕЗ К НАМ В МИНСК ХУДОЖНИК ИЗ КРЫМА ВИКТОР ФРОЛОВ. КАК НИКОМУ ДРУГОМУ БЛИЗКА ЭТА ТЕМА БЫВШЕМУ МОРЯКУ, ИЗБОРОЗДИВШЕМУ МНОГИЕ МОРЯ И ОКЕАНЫ. НЕБОЛЬШАЯ ПО КОЛИЧЕСТВУ РАБОТ ВЫСТАВКА, КОТОРАЯ ЭКСПОНИРУЕТСЯ ВО ДВОРЦЕ КУЛЬТУРЫ БЕЛСОВПРОФА, НЕСОМНЕННО, ОСТАВИТ У ЗРИТЕЛЕЙ ПРИЯТНОЕ ВПЕЧАТЛЕНИЕ.

НА СНИМКАХ: ХУДОЖНИК ВИКТОР ФРОЛОВ И ЕГО НЕКОТОРЫЕ КАРТИНЫ.

РОЗДУМ ПУБЛІЦЫСТА

ЧЫМ ЖА ПАКРЫЎДЗІЎ ВАС БЕЛАРУС, ШАНОЎНЫЯ РОДЗІЧЫ?

АЛЕСЬ МІКАЛАЙЧАНКА,
член ініцыятыўнай групы БНФ па правядзенню рэферэндуму.

Адзін мой знаёмы журналіст, рускі па нацыянальнасці, вельмі перажываючы за тое, што Беларускае Адраджэнне скоціцца ў балота махровага нацыяналізму і грамадзянскай вайны, нядаўна паўжартам-паўсур'ёзна сказаў мне: маўляў, прыйдуць неўзабаве казачкі з Дону на Беларусь, ужо ж яны пакажуць бізэфаўцам кузькіну матулю. Вунь Чэчня хутка дагуляецца ў суверэнітэт — дадуць ім данчакі дыхты. Ну, а я ў тон сумоўніку даў адказ як прадстаўніку ельцынаўскай дэмакратыі ў нашай рэспубліцы: беларусы таксама ўмеюць ў сёдлах добра трымацца — да гарадоў расійскіх неаднойчы даходзілі і бралі тыя гарады.

I

ВОСЬ так, значыцца, пажартавалі.

Але адно мне стала зразумела з гэтай размовы: нават лепшыя мае калегі, якімі зараз авалодала ідэя славянскага трыадзінства, ці те не могуць, ці то не жадаюць зразумець тое, што разумее, напрыклад, прафесар Уладзімір Калешка, сустаршыня Беларускага навукова-вытворчага кангрэса, які пры ўсёй яго павазе да расійскай культуры і мовы, у інтэрв'ю («ДВ» за 9 кастрычніка 1992 г.) карэспандэнту сказаў, што трэба ратаваць слыннае беларускае слова і што дапамагчы нам у гэтым павінны рускія інтэлігенты, бо, падкрэсліў Уладзімір Міхайлавіч, калі толькі будзе згублены беларускі этнас, пацерпіць усё славянства. На вялікі жаль, дзеячы Славянскага сабора, ПКБ, Каардынацыйнага камітэта іншых арганізацый, што надзвычай турбуюцца, каб «нацыяналісты» не знішчылі традыцыйную беларускую талерантнасць, і якія вельмі жадаюць зноў даць нашай рэспубліцы апекуна ў выглядзе «старэйшага брата», не могуць дайсці да той думкі, што ў славянстве ўсё ўзаемазвязана, што нават без усялякага прымусу роднасныя культуры павінны ўзбагачаць адзін адно. Ды вось бяда: у гісторыі Беларусі меў месца прымус, беларускую мову, у прыватнасці, спачатку знішчалі польскія каралі і расійскія цары, а потым — пілсудчыкі з бальшавікамі. Не будзем, не будзем забывацца на тое, адкуль прыйшоў на Беларусь бальшавізм, які ліквідаваў нашу нацыянальную інтэлігенцыю, а потым «рэфармаваў» нашу мову ў бок «злівання» з мовай расійскай.

Вось чаму трэба не займацца супрацьстаяннем Закону аб мовах на Беларусі, а наадварот— дапамагчы «малодшаму брату» ў ягоных самых неадкладных надзённых патрэбах. Па-роднаснаму, з пачуццём зычлівасці і разуменнем сітуацыі, у якую трапілі беларусы.

Чаму б, скажыце, панове славянафілы, вам не склікаць у Мінску сімпозіум вучоных-славістаў з Расіі, Украіны, Польшчы, Балгарыі, усіх славянскіх краін ды не параіцца з імі на навуковым ужо грунце, як і што зрабіць, каб пасля 200-гадовага застою ў развіцці беларускай мовы, яна не толькі выжыла б, але й заняла сваё пачэснае месца сярод родасных моў!

Вось тады нам, беларусам, былі б зразумелыя вашы клопаты-турботы сапраўды родных людзей, сапраўды сяброў.

Дык не, вам хочацца быць абавязкова такімі «старэйшымі братамі», пра якіх яшчэ Янка Купала напісаў у 1914 годзе верш «Сваякі»:

Раз абсеялі беларуса
Маскалі ды Ляхі,
І давай яму сваяцтва
Тыкаці з-пад пахі:
— Ты мой Ісьцінны браточак!
Маскалёк бармоча:
— Ты мой крэсьнік,
мой сыночак! —
Юда-лях сакоча.
Беларус жа ім на тое:
— Сваячкі мае вы:
Смачны жолудзь вам на кашу,
Дый высока дрэва!

Але збіраць сімпозіумы можна з людзьмі разумнымі, а не з тымі, хто ўсчынае лямант, што «нацыяналісты» зацісканць рускіх, што ўзаконьванне за дзяржаўную мову беларускай — гэта ўжо наступ макросы нацыяналізм, што рускае слова на Беларусі абавязкова загіне, калі не будзе таксама ўведзена ў ранг дзяржаўнага.

Каращей, гэты самы Славянскі сабор разам з неабальшавікамі Чэкіна, рознымі каардынацыйнымі камітэтамі ды іншымі прэтэндэнтамі ў браты і апекуны беларусаў закаціў апошнім часам такую істэрыю, хоць ты падымай нам угору рукі, ды ідзі да Хасбулатава ў Крэмль прасіцца пад расійскае крыло: маўляў, прабачце, мы яшчэ не саспелі і не дарасылі да ўласнага суверэнітэту, пакаранізуйце нас, калі ласка, яшчэ пару стагоддзяў, панове.

Можна было б гэтыя словы прымаць таксама як жарт, але вось нядаўна брэсцкія абласныя ды іншых рангаў мясцовыя дэпутаты з берасцейчыкі рашылі на поўным сур'ёзе дамагацца ад Вярхоўнага Савета, каб паставіць рускую мову ў ранг другой дзяржаўнай, а дэпутацкі «круглы» стол у тым жа Брэсце яшчэ пажадаў, каб мы з вамі мелі двайное грамадзянства (зразумела, беларускае і рускае) і такім чынам на доўгія гады замацавалі свой статус каланіяльных рабоў.

Паслухаеш гэтых крыкуноў, дык можа скласціся ўражанне, што нібыта на Беларусі рускіх выпураюць з гарадоў і вёсак, пазбаўляюць грамадзянскіх правоў, не даюць удасканальвацца іхняй культуры або не дазваляюць выпускаць газеты-часопісы па-руску. Мусіць, шавіністы, якія бесперашкодна атабарыліся на Беларусі, ды іх падпявалы з ліку абрусіфікаваных, зманкурчаных беларусаў-нігілістаў так нахабнеюць у нашай хаце, што не ведаюць, бедакі, якім ён бывае той нацыяналізм. Мяркую, ім перад тым, як лезці на ражон супраць Беларускага Адраджэння, трэба было б аб'ездзіць краіны незалежнай Балтыі, памеркавацца з тамтэйшымі сваімі суродзічамі, а потым пачытаць ды ўбачанае параўнаць з уласным становішчам у нашай рэспубліцы. Можа тады, паразумнелі б троху, ды пахвалілі тых людзей, якія шчыруюць на ніве нацыянальнага абуджэння (і такім чынам — на ніве ўзбагачэння славянскай культуры) за талерантнасць і тыя пачуцці брыцыянскага братэрства з прадстаўнікамі іншых славянскіх і неславянскіх нацый, што жывуць у нас альбо ў нас гасцююць. Мацаванне славянства за кошт знішчэння беларускай мовы і за кошт знявагі беларусаў? Варварства гэта, паны «дабрадзеі», і неўцтва!

II

Але ж людзям, з якімі гаспадары падзяліліся ў сваёй хаце не толькі квадратнымі метрамі, а яшчэ хлебам-салам, вельмі карціць даказаць усяму свету, што гаспадары без іх, гасцей, даўно прапалі б. Што наогул гэта хата ўжо не належыць гаспадарам ласкавым, а толькі ім, гасцям, якія пад чужым дахам займелі нават на хату свае правы.

Такая каланізатарская філасофія, зразумела, выклікае зусім натуральную рэакцыю суверэннага народа — жаданне займець уласнае войска. Сапраўды, з «дабрадзеямі», якія нас пужаюць казачкамі-данчакамі, трэба вуха трымаць востра!

Але нашы, таксама зманкурчаныя ўрад і парламент, калі нават нешта і робяць для замацавання нацыянальных прынцыпаў Беларусі, дык нібыта з-пад палкі. У Міністэрстве абароны, у сістэме якога, аказ-на пачатку снежня пройдзе рэферэндум, і калі ягоныя вынікі будуць непажаданымі для постбальшавіцкай наменклатуры, гэта армія, гэтыя афіцэры, якія не прысягнулі на вернасць народу Беларусі, прагнуўшыя ў хцівасці ды карупцыі, дзе да таго ж камандзіранні з'яўляюцца ў большасці прадстаўнікі нацыянальнасцей іншых дзяржаў, людзі з бальшавіцкім мысленнем (на працу да нас прыехаў нават знакаміты генерал Усхопчык з Вільні) —такія генералы могуць аб'явіць вынікі рэферэндуму незаконнымі, возьмуць на сябе «адказнасць за лёс Беларусі» і пачнуць тое, што не паспелі зрабіць Беларуская ваенная акруга падчас путчу ГКЧП. Пакуль у гэтым войску патрыятызм у «пасіву», а генералы прыбіраюць да рук тое, што дрэнна ляжыць, я маю права так разважаць. Бо тыя, хто можа і мае маральнае права бараніць беларускі народ — дзесяткі тысяч афіцэраў-беларусаў — усё яшчэ знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь у «гарачых» і «негарачых» кропках СНД. Ад іх просьбаў аб вяртанні на Радзіму ў Мінску адмаўляюцца як ад надакучлівых заадніў. Нашы землякі, аказваецца, тут нікому не патрэбны. Хаця ўрад, ствараючы Нацыянальную армію, павінен быў пайсці на пэўныя перамовы і з Ельцыным, і з Краўчукам, і з Назарбаевым пра тое, каб правесці абмен афіцэрскімі кадрамі — тады не трэба было б думаць пра кватэры, клапаціцца аб працаўладкаванні родных-блізкіх вайскоўцаў і г. д.

Ці не таму, што Міністэрства абароны РБ заехала ў гэтым сэнсе ў палітычную дрыгву, я нядаўна атрымаў пісьмы ад афіцэраў, якія напісалі свае водгукі на маё эсэ «Я прысягаю» («ДВ», 24 верасня 1992 года).

Адно з іх мушу друкаваць з невялікімі скарачэннямі.

«Паважаны Алесь Мікалайчанка!

Піша Вам ваеннаслужачы, капітан Пушнякоў Мікалай Аляксандравіч, беларус па нацыянальнасці, які служыў у апошні час на тэрыторыі Украіны і які дамогся пераводу адтуль да сябе, на Бацькаўшчыну. Пераводу мне гэты даўся ў знакі: пытанне зацягнулася ажно на паўгода, давялося звяртацца нават да прэзідэнта Краўчука.

Але я хачу Вам расказаць, што чакала мяне тут, на Радзіме.

Дык вось, завітаўшы ва ўправу кадраў Мінабароны РБ, я адразу даведаўся: пакуль няма маёй асабістай справы, то і рашэнне аб працаўладкаванні не будзе прынята. Я пачакаў два тыдні, прыйшла з Украіны сюды і мая справа. Вось тады супрацоўнік памянёнага ўпраўлення мне заявіў: паколькі я на Украіну прыехаў не па запрашэнню, а па свайму жаданню, мяне ў сістэме Міністэрства абароны Беларусі ніхто працаўладкоўваць не будзе, я нікому тут не патрэбен. Можаце ўявіць мой стан, калі я пачуў усё гэта.

Што ж тут рабіць? Давялося ставіць пытанне аб звальненні з армії, але, па словах прадстаўніка ўпраўлення кадраў, я павінен быў звольніцца на Украіне. А паколькі я адмовіўся там несці службу, то з'яўляюся нават «дэзерцірам».

Прозвішча гэтага работніка— таварыш Гікаўчук. Для мяне была зразумелая поўная абсурднасць гэтых інсінуацый, але нічога зрабіць я не мог.

У выніку я, капітан, які шмат гадоў праслужыў у армії, стаў беспрацоўным. Але ў адрозненне ад беспрацоўнага цывільнага я не мог атрымаць хаця б нейкія сродкі на жыццё-быццё: у мяне, афіцэра, проста няма на руках пашпарта. Калі б не родзічы, а я сам з Мінска, і мая сям'я стала жыве тут, ў Мінску, мне давялося б зусім цяжка.

Праўда, зараз упраўленне кадраў МА Беларусі ўзначаліў новы начальнік, і ёсць надзея, што мае праблемы вырашацца. Але я хачу, каб мне Міністэрства абароны, беларускі парламент, урад далі канкрэтны, зразумелы адказ: патрэбны я, афіцэр, беларус, Нацыянальнай армії Рэспублікі Беларусь? Патрэбны сваёй Айчыне ці не?»

Баюся, паважаны спадар Мікалай Пушнякоў, адказу Вы не дачакаецеся. Толькі калі Вам пашчасціць і новы начальнік праявіць міласэрнасць да сабрата па вайсковай прафесіі. А раптам ён або сам беларус, або паважае наш народ і, сапраўды, крэўна зацікаўлены ў будаўніцтве Узброеных Сіл Беларусі?

Тое ж самае, я магу сказаць аўтару другога ліста — былому саслужыўцу Мікалая Пушнякова — старшаму лейтэнанту Алегу Ткачову, які трапіў у аналагічную сітуацыю і, маючы сям'ю ў Мінску і сталічную прапіску, шукае зараз «цывільную» працу.

А ў войску, дзе генералы і афіцэры дэградуюць — крадуць, злоўжываюць службовым становішчам, дзе турбуюцца больш пра сябе, чым пра салдата, тым часам адбываюцца розныя недарэчнасці. Непадалёк ад Мінска, напрыклад, у адной з вайсковых частак адзін радавы тэрміновай службы, які стаяў на варце, ад няма чаго рабіць, пачаў сваволіць са зброяй і застрэліў знячэўку іншага вартавога. Пра гэта мне паведаміў капітан Аляксандр Бабыр, які даказвае, што існуючай армії не хапае прафесійнасці, што яе трэба неадкладна рэфармаваць.

Але ці будуць гэтым усур'ёз займацца генералы, якія, акрамя таго, што заняты ўзведзеннем уласных лецішчаў рукамі салдатаў, яшчэ нігілістычна ставяцца да нашага нацыянальнага Адраджэння, у тым ліку да існага адраджэння войска?

Калі я завяршаў працу над гэтым матэр'ялам, у газеце Беларускага ўрада «Рэспубліка» была надрукавана Пастанова Савета Міністраў «Пра меры спынення злоўжывання службовым становішчам асобнымі службовымі асобамі Узброеных Сіл» ад 15 кастрычніка г. г. Пастанова, скажу шчыра, вельмі мяккая ў адрас многіх карумпаваных, нячыстых на руку генералаў, але, мусіць, неабходная для навядзення ў армейскай гаспадарцы хаця нейкага парадку. На вялікі жаль, праблема стварэння нацыянальнага афіцэрскага корпусу ў гэтым высокім дакуменце не абгаворваецца.

III

Нацыянальная мова... Нацыянальнае войска... Нацыянальная адукацыя і культура... Рашэнне гэтых балючых пытанняў сёння ўпіраецца ў самую-самую праблему — адсутнасць нацыянальнай ідэі і свядомасці ў кіраўнікоў, тых, хто мае ўладу «зверху» да «нізу». Менавіта яны ставяць пад пагрозу самае дарагое наша заваяванне — суверэннасць і незалежнасць беларускай дзяржавы, менавіта з іхняй маўклівай згоды ў нашым доме сёння квітнее беларусафобія — і ў войску, і ў грамадскіх арганізацыях, і ў шматлікіх чыноўніцкіх апаратах.

Што ж, свае заваёвы мы нікому добраахвотна не аддзім і па-хамску адносіцца да беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў нікому не дазволім. Памятайце пра гэта тыя, хто да нас набліжаецца ў браты, трымаючы камень за пазухай.

СООБЩАЕТ АГЕНТСТВО РИД

КРАЖА ВЗРЫВЧАТКИ В ПЛАНЫ КОМАНДИРА ЧАСТИ НЕ ВХОДИЛА

80 КИЛОГРАММОВ тротила исчезло со склада воинской части под Минском.

Пропажа взрывчатки со склада гвардейского полка вызвала большой переполох. Расследованием занялась следственная группа особого отдела при КГБ республики. Уже через несколько дней половину пропавшего тротила удалось обнаружить, а попутно сыщики нашли также украденные ранее патроны, аккумуляторные батареи, снаряд от 122-миллиметрового орудия и взрывпакеты. По информации следственной группы, главные действующие лица истории — это лейтенант и старший лейтенант, проходящие службу в части. А всего под подозрение попало около ста человек. По словам командира части полковника Чижа, это была «незапланированная кража». Другой информации от командира гвардейцев журналистам МКТ, раскопавшим эту новость, получить не удалось.

АБХАЗСКИЕ БЕЖЕНЦЫ ПОД КРЫЛОМ ОРШАНСКИХ ВЛАСТЕЙ

ДЕНЕЖНУЮ помощь в 2 тысячи рублей выделил горисполком Орши очередной семье беженцев из Абхазии.

Статус беженца законодательно не определен в республике, хотя это и необходимо. Есть желающие, не брезгуя даровыми деньгами, выдать себя «жертвами». Тем не менее, статус беженца в Орше получили 23 семьи.

ВОДКА ПО ГОСЦЕНЕ — СВОБОДНО

ПОЧТИ что мгновенной была реакция магазинов на объявленную государством монополию на продажу винно-водочных и табачных изделий.

День-два продержав в очередях оршанцев за сторублевой водкой, спецмагазины опустели. Водка осталась стоять на полках. Доступ к ней впервые с начала года для владельцев карточек стал свободным, кооператоры «уступили». Госторговля расшевелилась или исчез канал утечки белой? Если верно последнее, то остается ждать, как ответят на это предприимчивые люди.

ЖЕРТВАМ «БОЛЬШОГО ПОГРОМА»

В БРЕСТЕ состоялось открытие памятного мемориального знака жертвам фашизма, приуроченное к 50-летию уничтожения еврейского гетто.

В 1942 году немцы расстреляли 24 тысячи евреев, в том числе стариков, детей, женщин. Всего в лагере смерти было уничтожено 34 тысячи мирных жителей.

Мемориальный знак построен на средства городского бюджета, еврейского культурно-просветительного общества «Тарбут», пожертвования частных лиц. Памятник установлен именно в том месте, где было расположено гетто.

РАТАВАННЕ

АДРЫНУТЫЯ?!

ВАЛЯНЦІНА ЕРАШЭНКА,
загадчыца дзіцячага сада № 56,
народны дэпутат гарсавета.

ЗДАЕЦЦА, відавочна, што ў любой дзяржаве галоўным крытэрыем маралі з'яўляюцца адносіны да старых і дзяцей. Да таго ж дзецям увага асаблівая, бо гэта нашы прадаўжальнікі, іх мы пасля сябе пакідаем на зямлі. Але як цяпер жывецца нашым безабаронным маленькім грамадзянам?

У віры ўсіх сённяшніх няўладкаванасцей і цяжкасцей жыць ім ўсё больш няўтульна. Бацькі зацягваюць паясы з-за шалёнага росту цэн. Дзеткі таксама адчуваюць бацькоўскія клопаты і перажываюць разам з імі. Ці ж на карысць ім гэта знерваванасць? Ідзе нейкі наступ на дзяцей з усіх бакоў. А сістэма дашкольнага выхавання проста разбураецца.

Пачалася дзяльба дзяцей на «сваіх» і «чужых». Гэтае робяць ведамствы, якія маюць свае садкі. Як ні дзіўна, менавіта дзеці аказаліся не проста лішнімі, а самымі галоўнымі ворагамі, вінаўнікамі іх эканамічных бедстваў. Пачалося павольнае закрыццё ведамасных садкоў.

Па прапанове ўрада створаны фонд ведамасных дашкольных устаноў. Здавалася б, гэта дапаможа, Але не! Бо разам з тым урад прыняў пастанову аб аплаце бацькамі сямідзесяці працэнтаў ад кошту харчавання дзяцей. А ці па кішэні гэта бацькам, шмат хто з якіх ледзьве зводзяць канцы з канцамі. Перабор выйшаў! І ў выніку многія бацькі не ведаюць, куды падзець дзяцей. Плаціць 600—700 рублёў за месяц немагчыма. І яны проста адмаўляюцца ад садка. Падкрэслю, не таму, што ён ім непатрэбны. Не. Патрэбны вельмі, але не вытрываць такога кошту, ну ніяк.

А ў выніку... Работнікі дашкольных устаноў пабывалі ў многіх сем'ях. Аказалася, што дзяцей пакідаюць дома адных альбо з непаўналетнімі братамі ці сёстрамі. Бывае і з кім прыйдзецца.

Толькі адно непрадуманае рашэнне прывяло да ланцужковай рэакцыі разбурэння. Не думаў наш урад пра дзяцей, калі прымаў такое рашэнне. Безумоўна, не думаў.

Не лягчэй навучэнцам. Многія школы перапоўнены, а зайдзіце ў сталовую. Там амаль пуста. І тут прычына не ў тым, што дзецям не хочацца есці. Бацькам зноў нестае грошай. Малыя бягуць на кухню, хапаюць (ды проста крадуць) хлеб, а пасля ўрокаў у некаторых стан блізкі да страты прытомнасці ад голаду. Уяўляеце, у наш час — ад голаду!!!

Няма ж, пэўна, чалавека, які б не разумеў, што значыць падкацэннае харчаванне для дзяцей. А рэальнасць такая жудасная. Росчыркам пяра высокія чыноўнікі нанеслі такі ўдар па нашаму генафонду, што не меншы за чарнобыльскі.

Не траціш надзею толькі таму, што ёсць і тыя, хто разумее: дзяцей трэба ратаваць. Яны не з вышыні, з якой ужо і не відаць анічога, паглядаюць на мірскія праблемы, а непасрэдна з імі сутыкаюцца, таму і лепш за іншых ведаюць. Гэта і дэпутаты нашай камісіі па адукацыі і выхаванню, іншых камісій, гарвыканкам. Усе мы «ламаем» галаву, дзе знайсці грошы, каб дапамагчы бацькам з аплатай за ўтрыманне ў садках, знізіць яе да трыццаці працэнтаў. Цяжкая справа, бо для горада гэта «вышэйшая» ў 40 мільёнаў рублёў штомесяц. А патрэбна таксама адшукаць грошы на бясплатныя абеды для вучняў з першага па чацвёрты класы.

Відаць, ратаванне прыйдзе, бо ўніклива падышоў да праблемы мэр горада Аляксандр Міхайлавіч Герасіменка. З паўслова зразумеў усё і падтрымаў прапанаваныя захады.

Калі ўсё скончыцца палёгкай і будзе адведзена пагроза развалу так доўга і грунтоўна ствараемай з году ў год сеткі дашкольных устаноў, значыць, перамог здаровы сэнс. Будуць ахаваны нашы дзеткі, будуць спакойна працаваць іх бацькі, не застануцца на вуліцы работнікі садкоў. Ці ж гэта не найвялікшая карысць?

Толькі паважніцеся, спадары кіруючыя чыноўнікі рэспублікі, як кажуць, тварам да дзяцей, калі вы лічыце сябе змагарамі за адраджэнне Беларусі. Адражэнне ж нацыі пачынаецца з нашых маленькіх грамадзян.

ПОЗВОЛЬТЕ ПРЕДСТАВИТЬ

«СОВЕРШЕННО НЕОБХОДИМЫЙ НА ЗАВОДЕ ЧЕЛОВЕК...»

ИОСИФ ПОЖОГА.
Фото В. КАЙГОРОДОВА.

РАБОЧИЙ день только начался. Тамара Васильевна не успела надеть белый халат, как в дверь постучали, и в здравпункт вошла работница склада готовой продукции. Глаза замутнены болью, лицо чуть ли не серое, походка неуверенная.

— Мне очень плохо, доктор...

Показания прибора для измерения давления заставили действовать быстро — очень похоже, что у женщины развился гипертонический криз.

Один укол, другой, третий. Баночный воротник, сердечные капли. Через полчаса больной полегчало...

На арендном предприятии «Крыніца» — более 800 работающих. И через маленький здравпункт, которым заведует фельдшер Т. В. Лазаренок, ежедневно проходит человек двадцать, а то и больше. Вот и сегодня еще нескольким пришлось обрабатывать микротравмы, снимать головную боль, «сбивать» давление. «Под занавес» привели с соседнего завода шампанских вин работницу с резаной раной предплечья с повреждением сухожилий. Из здравпункта, где ей оказали первую помощь, женщину увезла «скорая» — остальное должен доделать хирург...

— Не все находят время ходить по врачам и отстаивать очереди в поликлиниках, — говорит инженер Е. Г. Климович. — Особенно, когда недомогание небольшое. Вот и ходим к Тамаре Васильевне на консультации. Она внимательно выслушает, даже если очень спешит, даст совет, направит на лечение или сама проведет какие-то процедуры. Сейчас, когда жизнь становится все хуже, на таких людей вся надежда.

«Совершенно необходимый на заводе человек...» — эта фраза одного из пациентов фельдшера Лазаренок, на наш взгляд, наилучшим образом характеризует ее место в коллективе. Доброта, открытость, искренность и полная неспособность вести двойную игру в отношениях с людьми сделали ее кем-то большим, чем просто медработником. К ней идут излить душу, заручиться поддержкой, спросить совета. И потому у Тамары Васильевны так много друзей.

Успех в работе, признание в коллективе, отличный контакт с администрацией, которая помогает, — что еще нужно человеку! Наверное, можно назвать Тамару Васильевну счастливой. Но нельзя не сказать, что счастье это найдено не в погоне за лишним долларом на варшавской барахолке, не в бездумном накоплении богатств, а — в труде. Акушерка в райбольнице, медсестра в НИИ онкологии, фельдшер дома-интерната № 2 для инвалидов и престарелых, акушерка больницы «Скорой помощи»— все это далеко не «теплые местечки». Еще меньше напоминает их здравпункт «Крыніцы».

— Хватит вам, Тамара Васильевна, тянуть лямку на предприятии, — говорят порой коллеги. — Тринадцать лет отдали «Крыніцы» — теперь найдите работу поспокойнее. С вашими знаниями и опытом это будет нетрудно.

Но, похоже, и сами не верят, что их совету она последует.

НА СНИМКЕ: Т. В. Лазаренок.

НАМ ОТВЕЧАЮТ

В «ДОБРЫМ ВЕЧАРЫ» от 7 сентября было опубликовано письмо читателя Е. ПРЕСМАНА, в котором он предлагает открыть автобусную остановку возле типографии им. Ф. Скорины.

Вот что ответил НАЧАЛЬНИК ПРОИЗВОДСТВЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ ТРАНСПОРТА И СВЯЗИ МИНГОРИСПОЛКОМА ЛЕОНИД ИВАНОВ:

— Обустройство дополнительного остановочного пункта у здания типографии им. Ф. Скорины и издательства «Наука и техника» не согласовывает Госавтоинспекция города в связи с необеспечением безопасности движения (резкий уклон проезжей части, поворот и пр.). Кроме того, расстояние подхода от зданий указанных организаций до ближайшей остановки «Опытное поле» не превышает установленных нормативов — 500 метров.

В связи с закрытием движения транспорта по Староборисовскому тракту (реконструкция) и необходимостью обеспечения перевозок работников расположенных там организаций и предприятий, а также жителей, была временно изменена трасса автобусного маршрута № 13 (с заездом от Минской кольцевой дороги до НПО «Белстройнаука»).

Неоднократными изучениями пассажиропотоков на маршрутах, следующих по Староборисовскому тракту, установлено, что автобусным маршрутом № 25 перевозка пассажиров полностью обеспечивается, поэтому автобусный маршрут № 80 был переключен для обслуживания новых строящихся микрорайонов «Уручье-1, 6». По этой же причине считаем нецелесообразным учреждать дополнительную остановку «Опытное поле» для автобусного маршрута № 55, т. к. это приведет к потере преимуществ скоростного движения.

РАДИОПЕРЕХВАТ

СУВОРОВЦАМ И НЕ СНИЛОСЬ

РИД.

ВО ЛЬВОВЕ, на базе средней школы с физкультурной специализацией, открыт первый на Украине военный лицей; объявлено, что его выпускники получат гуманитарное образование с углубленным изучением естественных наук и языков. Вероятно, лицей станет привилегированным учебным заведением типа Кадетского корпуса, так как его выпускникам обещан гораздо более обширный перечень льгот при поступлении в высшие военные учебные заведения, чем, к примеру, курсантам суворовских училищ.

(Непонятно одно. Учатся ли в этой школе девушки и если да, то что они будут делать после утверждения учебных планов, где им места явно нет. Пойдут в боевые подруги?)

ДАЙДЖЕСТ «ДВ»

ДЕЛОВЫЕ ОПЕРАЦИИ В БЫВШЕМ СССР СОПРЯЖЕНЫ С РИСКОМ

ДЖИМ ШЕВИС, ЮСИА.

ВАШИНГТОН. «Делать бизнес в России, на Украине и в Казахстане — не для слабых людей», — заявил юрист из Милуоки **Уолтер УАЙТ** на открытии семинара Американской юридической ассоциации по возможностям зарубежных капиталовложений в трех бывших советских республиках.

«Россия не смогла принять новую Конституцию, отчасти из-за межнациональных конфликтов. Без Конституции отсутствует база для того, чтобы сделать законы эффективными и действенными. Страна быстро принимает законы в Верховном Совете, используя лавину декретов исполнительной власти, достоинство которых зачастую можно поставить под вопрос. Но даже когда законы уже существуют, их часто нельзя реализовать из-за отсутствия административных механизмов и структур для их проведения в жизнь», — сказал он.

Другие юристы говорили о новых законах, с которым сталкиваются зарубежные инвесторы, желающие вести дела на Украине и в Казахстане. Однако они согласились, что потенциал трех республик в долгосрочной перспективе превышает краткосрочный риск. «Возможности для предпринимательства зарубежных инвесторов столь велики, что многие готовы рискнуть», — сказал Уайт.

С этим мнением согласился **Джефри БЕРТ**, член вашингтонской юридической фирмы «Арнольд и Портер»: «Несмотря на хаотичные революционные процессы, наблюдаемые в настоящий момент, сегодня сложились наилучшие перспективы для активного участия западных компаний, обладающих терпением и ресурсами, в использовании огромного потенциала России и других рынков бывшего Советского Союза».

Общим элементом программ экономических реформ, объявленных Россией, Украиной и Казахстаном после развала административно-командной экономики Советского Союза, являются приватизация и зарубежные капиталовложения. Однако, как заметил **Джеймс МАНСЕЛЛ**, член нью-йоркской юридической фирмы «Клири, Готтлиб, Стин и Хамилтон», у каждой страны свой подход к приватизации и зарубежным капиталовложениям: «Приватизация — передача предприятий и другой собственности из рук государства в частный сектор — уже идет в России. Зарубежному инвестору, которого не пугает политический и экономический риск капиталовложений в России, приватизация может дать шанс на выгодных условиях получить доступ к потенциально огромному рынку.

На Украине, несмотря на то, что прошлой весной там объявили о широкомасштабных планах, приватизация заморожена, и вся программа либерально-экономических реформ подвергается пересмотру. Казахстан с гораздо большей осторожностью подходит к приватизации и с гораздо меньшим энтузиазмом относится к зарубежным капиталовложениям».

По словам **Айзека ШАПИРО** из нью-йоркской юридической фирмы «Скадден, Арпс, Слейт, Мигер и Флом», в экономике Казахстана продолжает господствовать государственный сектор: «В 1990 году государству принадлежало более 90 процентов основного капитала в стране. Остальное было в руках кооперативов и других частных владельцев. Как и во всем бывшем СССР, зарубежные капиталовложения существуют в Казахстане по большей части в форме совместных предприятий».

● ТЭХНІЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ «ДВ»

ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ПРЫЁМ У ВОСЬМЫМ КАНАЛЕ

ВАСІЛЬ ПЯСЕЦКІ.

(Працяг. Пачатак у № 197.)

БОЛЬШАСЦЬ жыхароў Мінска вядзе прыём праз тэлевізійныя антэны калектыўнага карыстання (ТАКК), а таксама праз так званыя кабельныя сістэмы. Значна меншая частка тэлегледачоў горада прымае тэлевізійныя праграмы праз пакаёвыя антэны, а таксама з дапамогай індывідуальных вонкавых антэн (пераважна ў раёнах з прыватнай забудовай).

Якасць тэлевізійнага прыёму залежыць ад вышыні будынка, на якім устаноўлена антэна, і характару навакольнай забудовы. Напрыклад, калі дзевяціпавярховы будынак засланяе ад перадаючай антэны шэраг будынкаў з меншай колькасцю паверхаў і яны аказваюцца ў так званай зоне «ценю», то якасць тэлевізійнага прыёму будзе значна пагоршана.

Паляпшэнне якасці прыёму ў «зацененых» участках горада можа быць дасягнута шляхам вынасу антэн на бліжэйшыя высокія будынкі, з дахаў якіх ёсць «прамая бачнасць», на перадаючую антэну тэлевізійнай станцыі. Падаваць тэлевізійныя сігналы ад такіх антэн у іншыя будынкі можна з дапамогай паветранай або падземнай кабельнай лініі.

Такія сістэмы ТАКК з вынесенымі на высокія будынкі антэнамі існуюць у горадзе ў вялікай колькасці. Звычайна сістэмы ТАКК у горадзе не маюць дадатковых антэнных узмацняльнікаў. Таму прыняты тэлевізійнай антэнай карысны сігнал памяншаецца на ўваходзе кожнага тэлевізара ў столькі разоў, колькі тэлевізараў падключана да гэтай ТАКК. Неабходна дадаць, што ёсць пэўныя страты карыснага сігналу і ў самой кабельнай сетцы ТАКК, што дадаткова зніжае ўзровень карыснага сігналу на антэнным уваходзе кожнага тэлевізара.

Неабходна зноў звярнуць увагу на магутнасці перадаючых станцый. Магутнасць перадатчыка 6-га канала амаль у 70 разоў большая, чым перадатчыка 8-га канала. Таму і напружанасць электрамагнітнага поля ў пункце прыёму ў 6-м канале будзе значна большай, чым у 8-м канале. Адпаведна і ўзроўні тэлевізійных сігналаў даных каналаў будуць значна адрознівацца. І не на карысць 8-га канала.

У сістэмах ТАКК на прыём у 6-м і 8-м частотных каналах працуе адна і тая ж антэна тыпу ТВК- 7/6 -12, якая мае каэфіцыент узмацнення 8 дБ (2,5 раза па напружанні). Затухание ж прымаемага сігнала ў 8-м канале некалькі большае, чым у 6-м канале, бо рабочыя частоты 8-га канала вышэйшыя, чым у 6-м канале. Таму і атрымліваецца, што слабы сігнал 8-га канала можа і не дайсці да ўваходаў тэлевізійных прыёмнікаў па кабельнай сетцы сістэмы ТАКК. У шматпавярховых будынках на самай справе так і здараецца.

Напрыклад, дзевяціпавярховы будынак знаходзіцца ў Заводскім раёне горада. На лесвічнай пляцоўцы кожнага паверха знаходзіцца па чатыры асобныя кватэры. Будынак аснашчаны сістэмай ТАКК без дадатковых антэнных узмацняльнікаў. На кожны пад'езд устаноўлена асобная антэна. І хоць будынак, ды і сам раён знаходзяцца з боку горада, які выходзіць на «прамую бачнасць» з тэлевізійнай мачтай у Калодзішчах, аднак прыёму менавіта ў 8-м канале няма па вышэй указаных прычынах. Складаецца такая сітуацыя: у кожнай кватэры ёсць хаця б адзін тэлевізар, а ў адным пад'ездзе ўжо налічваецца 36 кватэр і мінімум столькі ж тэлевізараў. У выніку прынятага антэнай сігнала 8-га канала яўна не хапае, каб размеркаваць яго з дастатковым для ўзнаўлення адлюстравання ўзроўнем для такой вялікай колькасці тэлевізараў. У сістэмах ТАКК, якія аснашчаны антэннымі ўзмацняльнікамі і могуць працаваць у паласе частот каналаў 6...12, прыём тэлевізійных перадач у 8-м канале будзе ажыццяўляцца з добрай якасцю.

Адчувальнасць чорна-белых тэлевізараў 11 класа звычайна 50 мкВ. У каляровых тэлевізарах гэта лічба можа быць горш — 80 мкВ (чым менш абсалютная лічба адчувальнасці, тым на самой справе яна вышэй), і тэлевізар можа ўзнавіць адлюстраванне на экране з меншым узроўнем карыснага сігнала на яго антэнным уваходзе.

Аднак для высокаякаснага прыёму на антэнны ўваход неабходна падаваць карысны сігнал з узроўнем, які павінен быць у шмат разоў большым, чым пазначаны мінімальны лічбы адчувальнасці.

Напрыклад, можна паведаміць, што згодна тэлевізійным стандартам D і K, якія прыняты ў СНД, напружанасць электрамагнітнага поля ў пункце прыёму ў III дыяпазоне ультракароткіх хваль (каналы 6...12) павінна быць не меней 720 мкВ/м. Можна дадаць, што ў 1 дыяпазоне УКХ (каналы 1 і 2) напружанасць электрамагнітнага поля павінна быць не меней 320 мкВ/м; у II дыяпазоне УКХ (каналы 3... 5) — не меней 500 мкВ/м, а ў IV (каналы 21...39) і V (каналы 40...60) дыяпазонах УКХ—3200 мкВ/м.

● СМЕХ СКРОЗЬ СЛЁЗЫ

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК «ДВ»

МАКСІМ ГРЭК, «ДВ».

(Працяг. Пачатак у №№ 182, 187, 192, 197).

О

Одум — стан разважання, засяроджанасці, паглыблення ў сябе. Спатрэбілася шмат часу, каб одум спусціўся на нашу зямлю.

Опій (опіум) — тое, што прытупляе розум, адурманьвае, перашкоджвае правільнаму ўспрыманню рэчаіснасці. Выклікае стан наркатычнага ачмурэння, які канчаецца балючай ломкай. Яе цяжка вытрываць, але неабходна, калі ёсць жаданне зноў вярнуцца да нармальнага, годнага чалавека існавання.

П

Паганскі — не мае нічога агульнага з «паганым». Прыметнік, які азначае якасць, уласцівасць або прыналежнасць прадмета або з'явы, што адносяцца да нехрысціянскай веры. Паганскія звычаі маюць моцныя карані ў сучасным жыцці. Пакланенне ідалам і догме, напрыклад, адзін з галоўных паганскіх звычаяў камуністычнага веравызнання.

Пагоня — выява збройнага вершніка на белым кані, што імчыць па чырвоным полі. Гістарычны герб нашай зямлі. Сёння, пасля працяглага адпачынку, Пагоня зноў імчыць за шчасцем і воляй беларускага люду.

